УДК 811.161.3’373.21

***Лена Васільеўна Леванцэвіч*[1], *Наталля Раманаўна Якубук*[2]**
[1]*канд. філал. навук, дац., заг. каф. беларускай філалогіі*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
[2]*канд. філал. навук, дац., дац. каф. беларускай філалогіі*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
**Lena Levantsevich[1], Natalia Yakubuk[2]**
[1]*Candidate of Philology, Associate Professor, Head of the Department of Belarusian Philology*
*at the Brest State A. S. Pushkin University*
[2]*Candidate of Philology, Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Belarusian Philology*
*at the Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: [1]lewalena@ mail.ru; [2]smalusha@yandex.by

# МІКРАТАПОНІМЫ-АРЫЕНЦІРЫ БРЭСТЧЫНЫ: СТРУКТУРА, СЕМАНТЫКА*

*Мэтай даследавання з’яўляецца выяўленне структурных тыпаў мікратапонімаў-арыенціраў, зафіксаваных на тэрыторыі Брэстчыны; вызначэнне структурна-семантычных асаблівасцей прыназоўнікава-іменных канструкцый. Базавай для тапаніміі з’яўляецца інфармацыя аб прасторы, якая рэпрэзентуецца ландшафтнай мадэллю. Спецыфічнай рысай мікратапанімічнай сістэмы Брэстчыны з’яўляецца наяўнасць у ёй найменняў, звязаных з лакалізацыяй аб’екта ў прасторы. У структурным плане – гэта прыназоўнікава-іменныя канструкцыі, якія ўяўляюць сабой спалучэнне прыназоўнікаў з назоўнікамі ва ўскосных склонах.*

***Ключавыя словы:*** *мікратапонім, онім, ландшафтны тапонім, прыназоўнікава-іменныя канструкцыі, структурная разнавіднасць.*

## *Microtoponyms-Landmarks of the Brest Region: Structure, Semantics*

*The aim of the study is to identify the structural types of microtoponyms-oriented, recorded on the territory of Brest region; to determine the structural and semantic features of the prepositional-name constructions. Basic for toponymy is information about space, which is represented by the landscape model. A specific feature of the microtoponymic system of Brest region is the presence in it of names associated with the localization of an object in space. In structural terms, these are prepositional-name constructions, which are a compound of prepositions with nouns in the indirect cases.*

***Key words:*** *microtoponym, onym, landscape toponym, prepositional-name constructions, structural variety.*

## Уводзіны

Вывучэнне онімаў на сучасным этапе развіцця анамастычнай навукі носіць антрапацэнтрычны характар, таму актуальным з’яўляецца даследаванне рэгіянальных падсістэм з уласцівымі ім спецыфікай і заканамернасцямі ўтварэння, функцыянавання і змянення тапанімічных адзінак. Рэгіянальная лексіка захоўвае ў сабе шмат фактаў і звестак, што маюць прынцыпова важнае значэнне для культуры, эканомікі, жыцця і побыту. Мікратапонімы, адносячыся да спецыфічнай часткі рэгіянальнай лексічнай сістэмы, з’яўляюцца важнай крыніцай разнастайнай лінгвістычнай і экстралінгвістычнай інфармацыі, таму што кожны рэгіён – своеасаблівая тэрыторыя са сваёй гісторыяй і традыцыямі. Гэта ўнікальны моўны матэрыял, які захоўвае цікавыя звесткі пра матэрыяльную і духоўную культуру, гісторыю народа. Па мікратапонімах можна прасачыць гісторыю таго ці іншага населенага пункта, змены ў жыцці цэлых пакаленняў.

Тапонімы Брэстчыны з’яўляюцца аб’ектам даследавання В. М. Емельяновіч, З. М. Заікі, Н. Р. Якубук (Смаль) і інш., падрабязны агляд прац быў зроблены ў артыкуле Л. В. Леванцэвіч [2]. Мікратапонімы Брэстчыны, звязаныя з лакалізацыяй аб’ек-

**Даследаванне ажыццяўлялася ў межах рэалізацыі НДР «Лінгвакультуралагічны кампанент у змесце асноўных этнаканцэптаў і ўласных найменняў Брэсцка-Пінскага моўнага рэгіёна» (№ ДР 20211558 ад 24.05.2021) пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.*

та ў прасторы, не былі аб’ектам асобнага даследавання.

Лексіка-семантычныя змены ў мове больш, чым якія-небудзь іншыя, выражаюць сувязь мовы з жыццём, дзейнасцю і мінулым народа, які гаворыць на гэтай мове. Семантыка слоў адлюстроўвае змены, якія адбываюцца ў грамадстве на розных этапах развіцця. Гэтая ўласцівасць характэрна і для тапанімічных адзінак як асаблівых знакаў культуры.

Мэта артыкула – выяўленне спецыфікі мікратапанімічнай сістэмы Брэстчыны; структурна-семантычны аналіз найменняў, звязаных з лакалізацыяй аб’екта ў прасторы, ці прыназоўнікава-іменных канструкцый.

**Асноўная частка**

Тапонімы любой тэрыторыі пры ўсёй іх разнастайнасці аказваюцца цесна звязанымі паміж сабой. Гэта тлумачыцца тым, што геаграфічныя назвы на кожнай гістарычна ці геаграфічна вылучанай тэрыторыі ўтвараюць пэўную сістэму.

Пры пабудове тапанімічнай мадэлі варта ўлічваць наступныя прынцыпы:

1) тапонім як імя ўласнае выдзяляе, індывідуалізуе аб’ект акаляючага свету;

2) тапонімы як імя ўласнае з’яўляюцца знакамі, якія ўтвараюць «персаналагічную» знакавую сістэму;

3) тапонім як моўны знак мае анталагічную сутнасць, якая вызначаецца абазначэннем рэальных аб’ектаў рэчаіснасці на аснове аперцэпцыі, – геаграфічныя назвы наўпрост звязаны з геаграфічнымі аб’ектамі;

4) тапонім з’яўляецца знакам высокага ўзроўню інфарматыўнасці (знак + яго значэнне і сэнс), што абумоўлівае яго гнасеалагічную аспектуальнасць;

5) тапонім рэгулюе адносіны аб’екта і ўяўленні пра аб’ект;

6) тапонім паўстае ў сваёй ментальнай сутнасці, якая расцэньваецца як нятоесная аб’ектыўная рэальнасць, нейкая яе частка, якая выступае кампанентам канкрэтна-гістарычнага суб’ектыўнага вопыту і мае на ўвазе зварот да моўнай свядомасці носьбіта мовы і да тапанімічнай сістэмы, яе кагнітыўнай структуры, якая ўплывае і адлюстроўваецца ў тапасістэме.

Далёка не ўсе мікратапонімы як назвы дробных геаграфічных аб’ектаў (у большай ступені, чым тапонімы) «ужываюцца на працягу доўгага часу, што можа быць абумоўлена як відазмяненнем самога аб’екта, так і зменамі ў рэльефе мясцовасці, грамадскім жыцці» [4, с. 28].

Базавай для тапаніміі з’яўляецца інфармацыя аб прасторы, якая рэпрэзентуецца ландшафтнай мадэллю. Найбольш частымі прасторавымі параметрамі з’яўляюцца такія, як канфігурацыя аб’екта, лакалізацыя аб’екта ў прасторы, лакалізацыя аб’екта ў адносінах да іншага аб’екта, вертыкальная арганізацыя прасторавых адносін. У ландшафтнай мадэлі намінатарам аб’екта выступае іменна чалавек, які сярод прасторавых адзінак выбірае найбольш вартасныя. «Асаблівасць арыентацыі ў гэтым выпадку заключаецца ў спецыфіцы выбару асноўнага аб’екта рэльефу, своеасаблівага цэнтра арыетацыі, у якасці якога выступаюць такія геаграфічныя рэаліі, як лес, балота, возера, рэчка і інш.» [1, с. 44].

Ландшафтны тапонім уяўляе сабой тапонім-індыкатар прыродных або культурных уласцівасцей ландшафту: гэта тапонім у зыходным сэнсе слова, ці месца ў яго праяўленні ў назве і назва ў яе адпаведнасці месцу. «Мовай» ландшафту лічацца тапонімы, пры дапамозе якіх магчыма ўзнаўляць гісторыю, культуру і этапы засваення прыроды чалавекам.

У нашым даследаванні аналізуюцца мікратапонімы-арыенціры, дзе ў якасці зыходнага аб’екта-арыенціра выступаюць часцей за ўсё водныя аб’екты (*балота, ставок, прорва, возера, канава, рака*), «дарога», ці месца перамяшчэння (*брод, гаць, дарога, мост, гасцінец, вал*), пабудаваныя, ці створаныя аб’екты (*бункер, аэрадром, останоўка, мураванка, пожарная, маяк*), расліны і іх агульныя назвы (*лес, гай, дуб, мох, алешнік, бярэзіна, іва, лаза, чарот, вярба*), культавыя аб’екты (*царква, крыж*), форма рэльефу (*даліна, груд, гара*), а таксама аб’екты, назвы якіх утвораны ад онімаў.

Як відаць з пералічаных аб’ектаў-арыенціраў, прыярытэтнымі з’яўляюцца ландшафтныя, а гэта водныя аб’екты, найперш балота і яго віды, што звязана з распаўсюджаннем балот на тэрыторыі Беларусі. Вобласць Беларускага Палесся ўяўляе сабой вялікую раўніну з пясчанымі дзюнамі, шматлікімі балотамі, маленькімі азёрамі і рачулкамі. Самыя старажытныя балоты Бе-

ларусі знаходзяцца на Палессі, іх узрост каля 11 тысяч гадоў. Балоты, рэкі і рачулкі ў сваю чаргу замінали перамяшчэнню з аднаго населенага пункта ў іншы, таму лагічна, што наступным па частотнасці аб’ектам-арыенцірам становіцца дарога і яе віды. У нашым даследаванні мікратапонімы – водныя аб’екты з’яўляюцца адлюстраваннем уласцівасцей як прыродных, так і культурных ландшафтаў, дапамагаюць убачыць своеасаблівасць пэўнай мясцовасці, адлюстраваць спецыфіку этнакультурнага і гістарычнага асваення данага рэгіёна.

Наступным важным ландшафтным аб’ектам для палешукоў з’яўляецца лес і яго расліннасць. Лясы і балоты як асноўныя элементы ландшафту Палесся адыгралі важную ролю ў фарміраванні ментальнасці, светапогляду і культуры беларусаў. Той раслінны свет, які акаляў старажытнае насельніцтва, выступае крыніцай вартаснай інфармацыі пра ландшафт і флору, а таксама пра адносіны чалавека да іх.

Ментальны вобраз воднай і лясной прасторы, які інтэрпрэтуецца як культурны ландшафт і адлюстраваны ў калектыўнай свядомасці, знайшоў выражэнне ў мікратапаніміі. Ландшафтны мікратапонім акрэсліваецца пэўнымі часавымі і прасторавымі межамі. Яго магчыма рэпрэзентаваць як сукупнасць вобразаў, сімвалаў, асацыяцый, знакаў культуры, якія адлюстроўваюць успрыняцце і ацэнку феномену вады ў свядомасці чалавека.

Спецыфічнай рысай мікратапанімічнай сістэмы Брэстчыны з’яўляецца наяўнасць у ёй найменняў, звязаных з лакалізацыяй аб’екта ў прасторы. У структурным плане гэта прыназоўнікава-іменныя канструкцыі, якія ўяўляюць сабой спалучэнне прыназоўнікаў з назоўнікамі ва ўскосных склонах. Тапаніміcты называюць іх мікратапонімамі-арыенцірамі, паколькі яны не толькі даюць найменне дробным геаграфічным аб’ектам, але і ўказваюць на месцазнаходжанне ўрочышча або на кірунак да яго. З іх дапамогай менш вядомыя мікрааб’екты абазначаюцца праз больш вядомыя.

На Брэстчыне намі вылучана некалькі структурных разнавіднасцей мікратапонімаў-арыенціраў.

І. Да першай групы адносяцца назвы, якія складаюцца з прыназоўніка і назоўніка ці прыметніка ва ўскосным склоне. Тут ужываюцца прыназоўнікі *в, во, возле, да, з, за, кай, каля (коло, кулу), на, над, од (от), пад (под, пуд, пут), по, протів, пры, у*: *В Гаёвы* п. (Гвозніца Мал.), *В Дворі́* с. (Гвозніца Мал.), *В Зашчы́ты* п. (Малая Турна Кам.), *В Карма́ні* луг (Яцкавічы Кам.), *В Купка́х* б. (Гвозніца Мал.), *В Мэ́лныках* п. (Гвозніца Мал.), *В Сыны́чыны* д. (Унучкі Кам.), *В Тренёвы* паша (Селяхі Бр.), *В Чві́ртях* п. (Камянюкі Кам.), *Во Мха́х* ур. (Краі Івац.), *Во́зле Боло́т* п. (Падлессе Радваніцкае Бр.), *Во́зле Госты́нця* п. (Дубавое Кам.), *Во́зле Ду́ба* п. (Соміна Івац.), *Да Та́нка* м. у л. (Лінова Пруж.), *Да Царквы́* уч. з. (Агароднікі Кам.), *З Закры́жжа* д. (Дубічы Мал.), *За Але́шнікам* п. (Арэхаўскі Кобр.), *За Гора́* п. (Камароўка Бр.), *За Тата́рінoм* п. (Краі Івац.), *За Ставо́к* п. (Селяхі Бр.), *Кай Разві́лкі* ч. в. (Целяханы Івац.), *Каля Ду́ба* п. (Лінова Пруж.), *Каля Курга́на* паша (Гвозніца Мал.), *Ко́ло Быржэ́зынкы* п. (Грушаўка Кам.), *Ко́ло Пчоловóда* ч. л. (Фядоры Стол.), *Ку́лу Кры́жа* п. (Кацельня Баярская Бр.), *На Вылы́чково* д. (Лышчыцы Бр.), *На Лысы́ччыное* п. (Печкі Мал.), *Над Бу́гом* луг (Гершоны Бр.), *От Колодэ́нського* с. (Чылеева Бр.), *От Па́нського* п. (Чылеева Бр.), *Пад Дуб* п. (в. Турная Івац.), *По Госты́нцю* п. (Дубавое Кам.), *Под Дуба́мы* л. (Олтуш Мал.), *Под Прі́рвою* л. (Олтуш Мал.), *Под Става́мы* л. (Камароўка Бр.), *Пуд Ва́лом* п. (Казловічы Бр.), *Про́тів Дома* с. (Макавішчы Кам.), *Пут Пэ́нь* с. (Добрае Кобр.), *Пры Лу́зе* ч. в. (Калоднае Стол.), *У Дем’яна* с. (Олтуш Мал.), *У Дуба́х* п. (Фядоры Стол. Бр.), *У За́гарадзішчы* л. (Краі Івац.), *У і́вы* ур. (Олтуш Мал.), *У Камаро́ўцы* л. (Селяхі Бр.), *У Камі́нскага* ч. в. (Бакуны Пруж.), *У Ланско́й* п. (Олтуш Мал.), *У Лозі́* ур. (Лісічыцы Бяроз.), *У Мі́шы* с. (Олтуш Мал.), *У Па́вла* ур. (Олтуш Мал.), *У Пузача́* л. (Целяханы Івац.), *У Ро́дзішчах* л. (Целяханы Івац.), *У Ро́зы* с. (Дубіны Кобр.), *У Са́вах* л. (Целяханы Івац.), *У Су́за* п. (Олтуш Мал.) і інш.

Прасторавае значэнне выражаюць як вытворныя, так і невытворныя прыназоўнікі. Увесь комплекс прасторавых адносін можна разбіць на дзве групы значэнняў: значэнне напрамку (прыназоўнікі з такім значэннем указваюць на кірунак дзеяння, рух кудынебудзь, да якой-небудзь мяжы), значэнне месцазнаходжання (прыназоўнікі з такім значэннем указваюць на месцазнаходжанне, становішча аднаго аб’екта адносна другога).

На Брэстчыне мікратапонімы-арыенціры часцей сустракаюцца з фармантам «за», які выступае або прыназоўнікам, або прыстаўкай. Спалучэнне з прыназоўнікам за ўжываецца ‘пры абазначэнні прадмета, месца і падобнае, за межы якіх накіравана дзеянне, рух або за якімі, па другі бок якіх знаходзіцца хто-, што-небудзь, адбываецца што-небудзь’, ‘пры абазначэнні прадмета, каля якога хот-небудзь размяшчаецца для работы або якога-небудзь занятку’; ‘ужываецца пры ўтварэнні назоўнікаў, прыметнікаў, прыслоўяў і абазначае: на тым баку, ззаду або за межамі чаго-небудзь’ [3, т. 2]. Прыведзеныя значэнні найбольш паслядоўна, поўна адпавядаюць сутнасці, прызначэнню і функцыі мікратапоніма-арыенціра – назваць, паказаць, дзе размешчаны называны аб’ект. Арыенцірам часцей служаць водны аб’ект або расліна.

Лакалізацыя ў прасторы выражаецца і прыназоўнікамі *на, пад, каля*.

Прыназоўнік *на* ўжываецца ‘пры абазначэнні месца, прадмета або асобы, у бок якіх накіравана дзеянне ці якія з’яўляюцца канцавым пунктам руху’, ‘пры абазначэнні месца, прасторы, у межы якіх накіраваны рух, дзеянне’, ‘пры ўказанні на прадмет або з’яву, якія служаць арыенцірам руху’, ‘пры абазначэнні месца ці прадмета, на якім знаходзіцца хто- або што-небудзь, адбываецца якое-небудзь дзеянне’, ‘пры абазначэнні прасторы або прадмета, у межах якіх адбываецца якое-небудзь дзеянне’, ‘пры абазначэнні месца, прасторы, унутры якіх адбываецца якое-небудзь дзеянне’ [3, т. 3]. Прыназоўнік *на* (з формай меснага склону) ужываецца для абазначэння паверхні, плошчы, якая з’яўляецца месцам размяшчэння аб’екта. У залежнасці ад семантыкі назоўніка агульнае значэнне месца мае мадыфікацыі: указанне на наваколле (*На Бро́дах, На Груда́х*), указанне на прадмет, які з’яўляецца месцам аб’екта (*На Моста́х, На Чырыта́х*), указанне на сферу, у межах якой размешчаны аб’ект (*На Па́сіцы*).

Фармант «пад» ужываецца як прыназоўнік і прыстаўка і выражае прасторавыя адносіны. Ужываецца ‘пры абазначэнні прадмета, ніжэй якога накіравана дзеянне’, ‘пры абазначэнні прадмета, у бок ніжняй часткі якога накіравана дзеянне’, ‘пры абазначэнні месца, прадмета ці асобы, у непасрэдную блізкасць да якіх накіравана дзеянне’, ‘пры абазначэнні прадмета або паняцця, пры назве дзеяння ці стану, у зону якіх накіравана іншае дзеянне’, ‘пры ўказанні на месца, у непасрэднай блізкасці ад якога адбываецца дзеянне або размяшчаецца, знаходзіцца хто-, што-небудзь’ [3, т. 3]. Значэнні месцазнаходжання і напрамку, якія выражаюцца прыназоўнікам *пад* (з формай творнага склону), адпавядаюць адно аднаму, у выражэнні яны адрозніваюцца толькі семантыкай галоўнага кампанента. З назоўнікамі, якія маюць прасторавую семантыку, прыназоўнік *пад* абазначае месца, у непасрэдную блізкасць да якога што-небудзь накіроўваецца *Пуд Дубо́к, Пуд Хуту́рі*.

З адным значэннем выкарыстоўваецца для ўтварэння мікратапонімаў прыназоўнік *каля* – ‘ужываецца пры абазначэнні асобы, прадмета, месца, паблізу або вакол якіх адбываецца што-небудзь, размяшчаецца хто-небудзь, што-небудзь’ [3, т. 2]. Названы прыназоўнік утварае прыназоўнікава-іменныя канструкцыі, якія ўказваюць на лакалізацыю аб’екта ў адносінах да іншага аб’екта, створанага чалавекам.

Найбольш прадуктыўнымі з’яўляюцца прыназоўнікі *за, на* і *пад* (вар. под, пуд, пут). Прыназоўнік *за* ўжываецца з творным склонам [*за* + Тв. скл.]: *За Але́шнікам* п. (Арэхаўскі Кобр.), *За Бу́нкерам* п. (Кругавічы Ганц.), *За Га́ем* б. (Грушаўка Кам.), *За Гру́шкай* п. (Белавусаўшчына, Пруж.), *За Густы́нцем* п. (Малыя Шчытнікі Бр.), *За Долы́ною* п. (Цюхінічы Бр.), *За Звыры́нцем* ур. (Малая Курніца Бр.), *За Лі́сом* с. (Агароднікі Кам.), *За Мо́стыком* п. (Беразнякі Кам.), *За Озыро́м* л. (Селяхі Бр.), *За Ро́вом* п. (Свіцічы Кам.), *За Сыло́м* п. (Падлессе Радваніцкае Бр.) *За Тапо́лямі* п. (Арэхаўскі Кобр.) і інш. Іменнай часткай такой канструкцыі найчасцей з’яўляюцца апелятывы. Радзей у якасці іменнай часткі выступаюць антрапонімы ці тапонімы: *За Бі́рыком* п. (Фядоры Стол.), *За Бугро́м* ур. (Лышча Пін.), *За Ву́лькію* п. (Смуга Бр.), *За Грэ́чкою* п. (Лышча Пін.), *За Дро́здыкам* п. (Лышча Пін.), *За Кана́вою* ч. в. (Фядоры Стол.), *За Капіта́нам* ур. (Лышча Пін.), *За Круко́вскім* ч. л. (Гарадная Стол.), *За Кузьмо́ю* (Верхалессе Кобр.), *За Матві́ем* ч. л. (Гарадная Стол.), *За Мі́шкою* п. (Верхалессе Кобр.), *За Пісьме́ном* л. (Калоднае Стол.), *За Сокулюко́м* п. (Верхалессе Кобр.), *За Шэ́віком* ур. (Целяханы Івац.) і інш.

Прыназоўнік *на* можа ўжывацца з вінавальным і месным склонамі.

У спалучэнні з вінавальным склонам [*на* + В. скл.] прыназоўнік *на* выкарыстоўваецца пераважна ў канструкцыях, якія служаць для абазначэння дарог або напрамку да пэўнага аб’екта: *На Азбэ́рына* п. (Кавярдзякі Бр.), *На Бу́ду* д. (Краі Івац.), *На Вульшы́ны* п. (Цюхінічы Бр.), *На Гу́ту* д. (Навасады Бр.), *На Дмытро́вычы* д. (Унучкі Кам.), *На Млыно́к* д. (Бабровічы Івац.), *На Пешча́ніцу*, д. (Краі Івац.), *На Плыска́ч* п. (Печкі Мал.), *На Пучы́ны* д. (Рудня Івац.), *На Худусы́* д. (Унучкі Кам.), *На Шухалі́* д. (Камянюкі Кам.) і інш.

Назвы з прыназоўнікам *на* з месным склонам імені [*на* + М. скл.] служаць для абазначэння ўрочышчаў. Яны ўказваюць на месца іх размяшчэння: *На Боло́ті* п. (Гарадная, Стол.), *На Бо́ровы* л. (Гвозніца Мал.), *На Бро́дах* б. (Грушаўка Кам.), *На Буді́сках* паша (Орхава Бр.), *На Вы́росі* узг. (Гвозніца Мал.), *На Гора́х* п. (Дубавое Кам.), *На Груда́х* узг. (Камянюкі Кам.), *На Гуруховы́шчэ* д. (Селяхі Бр.), *На Дво́рчышчах* луг (Завершаны Кам.), *На Ланах* п. (Астрамечава Бр.), *На Лу́зі* с. (Селяхі Бр.), *На Лы́шнянах* луг (Яцкавічы Кам.), *На Моста́х* ур. (Гвозніца Мал.), *На Па́сіцы* п. (Гвозніца Мал.), *На Прылу́ці* паша (Орхава Бр.), *На Пудо́мшэ* д. (Унучкі Кам.), *На Пыты́нныку* с. (Макавішчы Кам.), На Рі́чцы п. (Смуга Бр.), *На Хмэлішчы* с. (Камянюкі Кам.), *На Чырыта́х* с. (Камянюкі Кам.) і інш.

Прыназоўнік *пад* (вар. *под, пуд, пут*) ужываецца з творным і вінавальным склонамі, прычым часцей з творным [*пад* (*под, пуд, пут*) + Тв. скл.]: *Под Брудцём* п. (Вялікія Матыкалы Бр.), *Под Звыры́нцем* л. (Селяхі Бр.), *Под Казённым* п. (Макавішчы Кам.), *Под Мо́гілкамі* п. (Гершоны Бр.), *Пуд Брудко́м* б. (Гвозніца Мал.), *Пуд Бурко́м* п. (Чэрні Бр.), *Пуд Ва́лом* п. (Казловічы Бр.), *Пуд Вэрбо́ю* п. (Навалессе Мал.), *Пуд Горо́ю* узг. (Гвозніца Мал.), *Пуд Грыбко́м* ч. л. (Каленкавічы Кам.), *Пуд Дулы́нью* п. (Малыя Шчытнікі Бр.), *Пуд Лі́сом* п. (Хмелева Жаб.), *Пуд Ста́вамы* л. (Камароўка Бр.), *Пуд Убо́рою* луг (Унучкі Кам.), *Пуд Худуса́мы* п. (Унучкі Кам.), *Пуд Га́ткыю* п. (Падлессе Радваніцкае Бр.), *Пут Горо́ю* п. (Падлессе Радваніцкае Бр.). Іменнай часткай такіх канструкцый звычайна выступаюць апелятывы.

Мікратапонімаў, утвораных па мадэлі [*Под* (*пуд, пут*) + В. скл.] зафіксавана значна менш: *Под Лепе́шко* п. (Калоднае Стол.), *Пуд До́брэ* п., с. (Добрае Кобр.), *Пуд Дуб* с. (Добрае Кобр.), *Пуд Дубкы́* п. (Макраны Мал.), *Пуд Дубо́к* с. (Дубіны Кобр.), *Пуд Куро́ткі* п. (Унучкі Кам.), *Пуд Лазо́к* п. (Аніскавічы Кобр.), *Пуд Хутурі́* п. (Унучкі Кам.), *Пут Корна́ч* п. (Дубіны Кобр.), *Пут Кру́глэ* с. (Залескія Кобр.), *Пут Пэ́нь* с. (Добрае Кобр.).

На аснове прааналізаванага матэрыялу можна зрабіць выснову, што мікратапонімы-арыенціры з прыназоўнікам *пад* (*под, пуд, пут*) у спалучэнні з вінавальным і творным склонамі больш уласцівыя назвам палёў, лугоў, урочышчаў. Для абазначэння іншых аб’ектаў яны амаль не выкарыстоўваюцца.

Пашыраны на даследаванай тэрыторыі і мікратапонімы з прыназоўнікам *каля* (*коло, кулу*) у спалучэнні з родным склонам апелятыва [*каля* (*коло, кулу*) + Р. скл.]. Такія канструкцыі, як правіла, выкарыстоўваюцца для абазначэння ўрочышчаў: *Каля Бо́чкі* п. (Арэхаўскі Кобр.), *Ко́ло Арэдро́ма* п. (Фядоры Стол.), *Ко́ло Бырэ́зынкы* п. (Грушаўка Кам.), *Ко́ло Бэ́роста* с. (Дубіны Кобр.), *Ко́ло Вульша́ны* п. (Падлессе Радваніцкае Бр.), *Ко́ло Го́зэра* л. (Фядоры Стол.), *Ко́ло Еродро́ма* п. (Унучкі Кам.), *Ко́ло Конюшні* ч. в. (Фядоры Стол.), *Ко́ло Ко́мплекса* п. (Фядоры Стол.), *Ко́ло Лі́са* п. (Ленінскі Жаб.), *Ко́ло Лу́жка* п. (Вялікая Турна Кам.), *Ко́ло Мо́глыц* ч. в. (Нячатава Стол.), *Ко́ло Муро́ванкі* п. (Малая Турна Кам.), *Ко́ло Останоу́кі* ч. в. (Фядоры Стол.), *Ко́ло Па́секі* ч. л. (Фядоры Стол.), *Ко́ло Пожа́рнэй* п. (Фядоры Стол.), *Ко́ло Рыкы́* п. (Малая Курніца Бр.), *Ко́ло Сімафо́ра* п. (Ляхаўцы Мал.), *Ку́лу Кры́жа* п. (Кацельня Баярская Бр.), *Ку́лу Маяка́* п. (Масевічы Мал.). Часта ў ролі іменнай часткі выступаюць антрапонімы: *Каля Ма́дныка* д. (Опаль Іван.), *Каля Тата́рына* паша (Гвозніца Мал.), *Каля Федора́* м. у л. (Дубіца Бр.), *Ко́ло Бі́рыка* ч. в. (Фядоры Стол.), *Ко́ло Ёхіма* п. (Каленкавічы Кам.), *Ко́ло Круко́вского* ч. л. (Гарадная Стол.), *Ко́ло Плыскача́* уч. з. (Печкі Мал.), *Ко́ло Струкалы́хы* ч. в. (Фядоры Стол.), *Ко́ло Стыра́* с. (Фядоры Стол.), *Ко́ло Фамюка́* п. (Крынкі Кам.), *Ко́ло Шчу́поль* ч. л. (Нячатава Стол.), *Ку́лу Блёка* п. (Масевічы Мал.) і інш.

II. Даволі распаўсюджаная з'ява ў мікратапаніміі Брэстчыны – наяўнасць прыназоўнікава-іменных канструкцый, якія ўяўляюць сабой састаўныя назвы, што складаюцца з прыназоўніка, апелятыва-назоўніка і прыметніка (лічэбніка), што яго паясняе: *За Косо́й Доро́гою* п. (Цюхінічы Бр.); *На Вылы́кэ По́ле* д. (Селяхі Бр.), *На Бі́лу Даро́га* д. (Камянюкі Кам.), *На Тро́х Заго́нах* с. (Макавішчы Кам.), *На Муро́зувой Гурі* п. (Унучкі Кам.); *Ко́ло Камэнэ́цькыі Доро́гы* п. (Трасцяніца Кам.), *Ко́ло Карпуко́выі Горы́* луг (Дубавок Кам.), *Ко́ло Дымэ́ныцького Госты́нца* п. (Вял. Турна Кам.); *Ко́ло Комарі́вськый Ны́вкы* л. (Селяхі Бр.), *Ко́ло Ко́сого Моста́* п. (Фядоры Стол.); *По Паніко́вськуй Доро́зы* п. (Дубавое Кам.), *По Про́стуй Доро́зы* п. (Дубавое Кам.), *По Ста́руй Доро́зы* п. (Дубавое Кам.); *Пуд Юсты́ніным Ду́бом* п. (Навалессе Мал.).

Часам апелятыў у такіх канструкцыях можа адсутнічаць, а прыметнік, які застаецца, субстантывуецца: *Ко́ло Байдо́вського* п. (Пералум'е Жаб.), *Ко́ло Батра́цького* с. (Селяхі Бр.); *На За́дніх* с. (Камянюкі Кам.), *На Лысы́ччыном* п. (Печкі Мал.), *На Груша́цкого* п. (Кавярдзякі Бр.), *На Каза́цькых* с. (Камянюкі Кам.), *На Шу́товым* с. (Камянюкі Кам.), *На Шыро́куму* п. (Унучкі Кам.); *От Колодэ́нського* с. (Чылеева Бр.), *От Па́нського* п. (Чылеева Бр.), *Под Казённым* п. (Макавішчы Кам.), *Пуд До́брэ* п. (Добрак Кобр.), *Пуд Куро́ткі* п. (Унучкі Кам.), *Пут Кру́глэ* с. (Залескія Кобр.); *У Смоляны́м* уч. з. (Печкі Мал.), *У Трэнёвым* д. (Селяхі Бр.).

III. Наступная мадэль – мікратапонімы, якія складаюцца з назоўніка ў назоўным склоне і прыназоўнікавай канструкцыі, што паясняе гэты назоўнік: *Госты́нэць до Двора́* д. (Селяхі Бр.), *Доро́га на Ры́тэц* д. (Орхава Бр.), *Доро́га за Сэло́м* д. (Палінаўка Кам.), *Доро́га на Коло́дно* д. (Церабунь Бр.), *Доро́га на Шумакі́* д. (Церабунь Бр.), *Дуро́га ду Новэ́цьковыч* д. (Шышова Кам.), *Кэ́мпа в Антыпо́рувшчыны* п. (Малая Курніца Бр.), *Кэ́мпа на Борку́* п. (Малая Курніца Бр.), *Ліс на Подру́чнуй* л. (Дружба Бр.), *Луг на Подры́ччэ* луг (Старое Сяло Жаб.), *Лысо́к на Пыска́х* л. (Чылеева Бр.), *Мост праз Безо́дну* мост (Барысы Бр.), *Мыст на Пе́чкі* мост (Велікарыта Мал.), *Ны́вка над Боло́том* п. (Старое Сяло Жаб.), *По́лэ под Крэжо́м* ч. п. (Каленкавічы Кам.), *Попэрэ́чкы ко́ло Луга́* п. (Грушаўка Кам.), *Стэ́жка до Сыляхі́в* д. (Камароўка Бр.), *Стэ́шка за Гуро́дом* д. (Ёжыкі Жаб.), *Шоса́ на Тырыбу́нь* д. (Пяскі Бр.). Іншы раз сустракаюцца назвы з адваротным парадкам састаўных элементаў: *В Балаві́ж Доро́га* д. (Камянюкі Кам.), *В Ляцькы́і Доро́га* д. (Камянюкі Кам.), *Од Боро́дыцького Чві́рць* п. (Камянюкі Кам.), *Од Сэлішча́нського Чві́рць* п. (Камянюкі Кам.), *Кулу́ Багна́ Стрэ́лка* с. (Хамуціны Кам.).

Часта другая частка тапоніма паясняецца прыметнікам: *Ліс на Вошы́вуй Горі́* л. (Дружба Бр.), *Мы́ст на Колхо́зны Двор* мост (Велікарыта Мал.), *По́ле каля Лысы́ччыного хутора* п. (Печкі Мал.), *Рів за До́вгым Лі́сом* р. (Хамуціны Кам.). Сустракаюцца выпадкі, калі паясняецца першая частка тапоніма: *Пе́ршы Рыв уд Рыкі́* роў (Хамуцічы Кам.), *Дру́гі рыв уд Рыкі́* роў (Хамуціны Кам.), *Трэ́ті Рыв уд Рыкі́* роў (Хамуцічы Кам.), *Сэрэ́дня Доро́га в Пры́борово* д. (Харсы Бр.). Аб'ектамі такіх назваў могуць быць урочышчы, палі, балоты. Прыназоўнікавыя канструкцыі ў гэтых назвах абазначаюць напрамак або месца размяшчэння геаграфічнага аб'екта і з'яўляюцца азначэннем да назоўнікаў.

**Заключэнне**

Мікратапонімы-арыенціры разглядаюцца намі як вербальна-ментальны сродак перадачы рэальнага ландшафту і з'яўляюцца ландшафтнамі сімваламі. Як і іншыя сімвалы, мікратапонімы змяшчаюць у сабе моўную вобразнасць і здольныя ўвасабляць пачуцці, ідэі, настрой, пры гэтым не адбываецца адлюстравання ўласна прыроды. Састаўныя мікратапонімы можна разглядаць як вербальна-эмацыянальную інтэрпрэтацыю ландшафту, якая дазваляе выражаць унутраны стан чалавека шляхам выкарыстання сродкаў моўнай выразнасці.

Характэрнай асаблівасцю мікратапонімаў-арыенціраў з'яўляецца іх намінатыўнасць. *За ракой* перастае быць акалічнасцю месца, набывае функцыю намінацыі – *Поле за Ракой*. Назваў гэтага тыпу параўнальна многа, і выступаюць яны побач з прэфіксальнымі і прэфіксальна-суфіксальнымі мікратапонімамі, тыпу *Зарака, Зарэчча*, як раўназначныя. Часам яны існуюць паралельна.

Сярод мікратапонімаў-арыенціраў прадуктыўнымі з'яўляюцца прыназоўнікава-

іменныя канструкцыі з кампанентамі *за, на* і *пад*. Названыя прыназоўнікі з'яўляюцца найбольш прыдатнымі для выражэння лакалізацыі аб'екта ў адносінах да іншага аб'екта. У сваю чаргу, гэты прасторавы параметр адназначна і паслядоўна рэпрэзентуе ландшафтную мадэль, якая з'яўляецца базавай для тапаніміі.

Для выражэння значэнняў напрамку і месцазнаходжання выкарыстоўваюцца як розныя прыназоўнікі, якім уласціва толькі адно пэўнае значэнне, так і прыназоўнікі, якія сумяшчаюць абодва значэнні адначасова. Значэнне месцазнаходжання мае невытворны прыназоўнік *каля*. Абодва значэнні (напрамку і месцазнаходжання) выражаюцца прыназоўнікамі *за, пад, на*. Дыферэнцыяцыя адбываецца за кошт склону назоўніка: значэнне напрамку звычайна перадаецца ў спалучэнні прыназоўніка з формай вінавальнага склону, а значэнне месцазнаходжання – з формай творнага склону.

## СПІС СКАРАЧЭННЯЎ І ЎМОЎНЫХ АБАЗНАЧЭННЯЎ

Раёны:
Бр. – Брэсцкі
Бяроз. – Бярозаўскі
Ганц. – Ганцавіцкі
Жаб. – Жабінкаўскі
Івац. – Івацэвіцкі
Кам. – Камянецкі
Малар. – Маларыцкі
Пін. – Пінскі
Пруж. – Пружанскі
Стол. – Столінскі

Іншыя скарачэнні:
б. – балота
д. – дарога
л. – лес
м. у л. – месца ў лесе
п. – поле
р. – роў
узв. – узвышша
узг. – узгорак
ур. – урочышча
уч. з. – участак зямлі
ч. л. – частка лесу
ч. в. – частка вёскі

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Аліферчык, Т. М. Тапанімія Заходняга Палесся: этналінгвістычны аспект / Т. М. Аліферчык. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – 255 с.
2. Леванцэвіч, Л. В. Крыніцазнаўства даследаванняў анамастыкі мовы Брэсцка-Пінскага Палесся / Л. В. Леванцэвіч // Мова Брэсцка-Пінскага Палесся : зб. навук. арт. / Брэсц. дзярж. ун-т ; рэдкал.: М. М. Аляхновіч [і інш.]. – Брэст : БрДУ, 2010. – С. 57–65.
3. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / рэдкал.: К. К. Атраховіч (агул. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1977 – 1984. – 5 т.
4. Шклярык, В. А. Мікратапанімія Усходняга Палесся ў кантэксце развіцця рэгіянальнай лексічнай сістэмы / В. А. Шклярык ; навук. рэд. І. Л. Капылоў. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2019. – 196 с.

## REFERENCES

1. Alifierchyk, T. M. Tapanimija Zakhodniaha Paliessia: etnalihvistychny aspiekt / T. M. Alifierchyk. – Minsk : Bielarus. navuka, 2013. – 255 s.
2. Lievancevich, L. V. Krynicaznaustva dasliedavanniau anamastyki movy Brescka-Pinskaha Paliessia / L. V. Lievancevich // Mova Brescka-Pinskaha Paliessia : zb. navuk. art. / Bresc. dziarzh. un-t ; redkal.: M. M. Aliakhnovich [i insh.]. – Brest : BrDU, 2010. – S. 57–65.
3. Tlumazhal'ny slounik bielaruskaj movy : u 5 t. / redkal.: K. K. Atrakhovich (ahul. red.) [i nsh.]. – Minsk : BielSE, 1977–1984. – 5 t.
4. Shkliaryk, V. A. Mikratapanimija Uskhodniaha Paliessia u kantekscie razviccia rehijanal'naj lieksichnaj sistemy / V. A. Shkliaryk ; navuk. red. I. L. Kapylou. – 2-je vyd. – Minsk : Bielarus. navuka, 2019. – 196 s.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 02.10.2021*